Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 ЛІСТАПАДА 2020 г. АЎТОРАК № 224 (29338)

«ЭЎРЫКА» ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА 5

АПОШНІ ЛІСТАПАД ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ 12

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«У Беларусі ёсць усе рэсурсы для аказання неабходнай сацыяльнай дапамогі грамадзянам. За час незалежнага развіцця нашай краіны сацыяльная абарона набыла ўстойлівую сістэму. Наша праца накіравана на падтрымку і абслугоўванне пажылых людзей у той перыяд, калі яны страчваюць працаздольнасць і маюць асабліва вострую патрэбу ва ўвазе і клопаце. Гэта і пенсійнае забеспячэнне: штогод у нашай краіне на названыя мэты выдзяляецца больш за Br13 млрд. У нас наладжана дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога людзям, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, штогод на гэтыя мэты выдзяляецца больш за Br100 млн. Акрамя гэтага, мы праводзім вялікую работу для людзей з аслабленымі фізічнымі магчымасцямі, стараемся забяспечыць ім актыўнае і дастойнае жыццё».

ВЯТРАК І ЯГО ГАСПАДЫНЯ

Некалі Беларусь славілася сваімі млынамі — вадзянымі і ветранымі. Ветраныя называліся проста — вятрак. Хоць той час незваротна мінуў, але млыны з ветранымі рухавікамі засталіся ў музеях пад адкрытым небам. У музейным комплексе «Дудуткі» ў Пухавіцкім раёне захаваўся самы стары драўляны шатровы вятрак, пабудаваны яшчэ ў 1905 годзе. Вядома, цяпер ён — сапраўдны рарытэт і музейная каштоўнасць, помнік сялянскага дойлідства і матэрыяльнай культуры Беларусі. Пра гэта ведае і заўсёды расказвае Святлана БАГЕЛЬ — супрацоўніца музея і гаспадыня «Хаты завозніка» на дудуткаўскім млынаровым падворку. Гэтымі днямі Святлана Рыгораўна паклікала цікаўных на вельмі рэдкую «імпрэзу» — запуск рэканструяванага ветрака. Справа ў тым, што гістарычны мукамольны агрэгат доўгі час быў на «капрамонце» — рамантавалі яго драўляны механізм, выраблялі дубовыя дэталі, мянялі падрубу. У час восеньскага народнага свята «Кузьмінкі» (а гэта свята млынароў і кавалёў), турыстычны аб'ект ізноў «ажыў», запрацаваў, закруціліся яго «махі» альбо «лопасці», пайшлі жорны. Перад запускам, як і належыць, вятрак асвяцілі на доўгі век і плённую працу.

Святлана Багель даглядае вятрак і праводзіць тут экскурсіі ўжо трынаццаць гадоў — яна дасканала ведае асабістыя гісторыі майстроў, якія стварылі гэты цуд, і незайздросную «долю» драўлянага асілка. У сваім прыгожым строі, вышытым уласнымі рукамі, яна заўсёды ветла сустракае гасцей у ролі самой жонкі млынара.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КОРАТКА

- **ДАІ заклікае кіроўцаў быць уважлівымі пры пагаршэнні ўмоў надвор'я.**
- Электронныя віньеткі для аплаты праезду па дарогах нашай краіны запрацуюць з 15 снежня.
- **ВУП Беларусі ў студзені — кастрычніку знізіўся на 1,1 %.**
- Новыя пелетныя заводы ў кастрычніку адгрузілі паліўных гранул больш чым на 1,1 млн еўра.
- **У Беларусі завяршылі закладку плодаагароднінай прадукцыі ў стаб-фонды.**
- Пяць камандаў БДУ выступяць у паўфінале ЧС па праграмаванні сярод студэнтаў.

ISSN 1990 - 763X

Пазнай свой край

ЧАС НА... ПАДУМАЦЬ,

або Чаму гэты год не трэба лічыць правальным для турызму?

2020-ы прынёс беларускаму турызму не толькі выпрабаванні, але і шэраг адкрыццяў. У каранакрызісны перыяд, калі попыт на арганізаваны адпачынак знізіўся, у прадстаўнікоў турыстычнай галіны з'явіўся час для таго, каб падумаць над стварэннем новых прапаноў і распрацоўкай іншых правілаў гульні. СТАР. 5

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Эканоміка

ЭФЕКТЫЎНЫЯ МЕГАВАТЫ

Ад ветру, вады, сонца і смецця

Стварэнне электрыфікаваных раёнаў шматкватэрных дамоў, укараненне новых тэхналогій, якія працуюць на электраэнергіі, зніжэнне да канца года энергаёмістасці на 0,7 %, а таксама будаўніцтва ў сталіцы завода для спальвання смецця, дзе будуць перапрацоўваць да паўмільёна тон адходаў штогод. Гэтыя і іншыя планы дзяржпраграмы «Энергазберажэнне» на 2021—2025 гады, якая цяпер узгадняецца, а таксама некаторыя вынікі папярэдняй агучылі спецыялісты падчас анлайн-канферэнцыі ў БелТА.

Менш імпартных ПЭР, больш айчынных МВП

Энергаёмістасць ВУП Беларусі, па інфармацыі міжнароднага энергетычнага агенцтва, складае 160 кілаграмаў нафтавага эквіваленту па парытэце пакупніцкай здольнасці на тысячу долараў ЗША (кг н.э./тыс. долараў). Нашу краіну па гэтым паказчыку можна параўнаць з такімі дзяржавамі, як Фінляндыя і Канада, аднак разам з тым ВУП Беларусі на 20 % вышэй за сярэднесусветны ўзровень. Пры гэтым курс на змяншэнне энергаёмістасці — не самамэта, каб наблізіцца да энергаёмістасці сярэднесусветнага ўзроўню, а задача, каб як мага менш спажываць паліўна-энергетычных рэсурсаў, 83,5 % якіх краіна імпартуе, паведаміў **Міхаіл МАЛАШАНКА, намеснік старшыні Дзяржкамітэта па стандартызацыі, дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці:**

— Ад энергетычнага складніка ў значнай ступені залежаць выдаткі вытворчасці і матэрыяльны дабрабыт грамадства, а энергетычны патэнцыял эканомікі і яе энергаэфектыўнасць у сучасным свеце — важны паказчык развіцця дзяржавы. СТАР. 4